ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

7 ЧЭРВЕНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15842)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Маладыя імёны

Вера ЯРОШЫК:

«МУЗЫКА — ГАЛОЎНАЕ Ў МАІМ ЖЫЦЦІ»

Да нядаўняга часу пра аграгарадок Дзівін Кобрынскага раёна чулі нямногія. Але дзякуючы таленавітай дзесяцікласніцы Веры ЯРОШЫК пра гэта мястэчка даведаліся далёка за межамі Беларусі. Юная спявачка заняла другое месца на тэлевізійным праекце «Ты супер!», які выходзіў на расійскім тэлеканале НТБ. Гэта міжнародны вакальны конкурс для дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Пранікнёнымі выступленнямі 16-гадовая Вера скарыла і прафесійнае журы, і гледачоў. Пра музыку ў сваім жыцці, самых блізкіх людзей і планы на будучыню дзяўчына расказала ў інтэрв'ю «Чырвонцы. Чырвонай змене».

— Вера, як трапіла на праект «Ты супер!»?

— Я спрабавала ўдзельнічаць усюды, наколькі гэта было магчыма ў маіх умовах. Пачатак паклаў рэспубліканскі конкурс «Я спяваю» на АНТ, які адбыўся ў 2012 годзе. Потым сталі запрашаць выступаць на канцэрты. Напэўна, таму арганізатары праекта на НТБ мяне і заўважылі. І так атрымалася, што ў снежні мінулага года яго партнёр — радыё Sputnik — выйшаў на мяне і запрасіў на кастынг. А ў студзені паведамілі, што я прайшла адбор.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Клуб «Залатыя рукі»

ЧЫМ КАЗАНЬ БРАЦЬ БУДЗЕМ?

Прафесійным майстэрствам і крэатыўным падыходам

«Гэтая мадэль рукзакоў прызначана для маладых дзяўчат, таму дызайн вітрыны прадстаўлены ў выглядзе вокладкі часопіса моды з трэндамі вясны. Канцэпцыя паўтарае здымкі на Polaroid як адсылку да Instagram, якім карыстаюцца прадстаўніцы мэтавай аўдыторыі. Кубы на фоне сімвалізуюць шматпавярховікі горада. Асноўным колерам абраны трэндавы пяшчотна-ружовы... Кампазіцыя нагадвае пра вясеннія дні, пікнікі і пасядзелкі».

«Вывучыўшы ўсе тэндэнцыі моды, я магу казаць, што на сённяшні дзень рукзакі ўсё больш набіраюць папулярнасць сярод модніц. Раней гэта быў аксесуар спартыўнага стылю без асаблівых індывідуальных рыс. А цяпер ён мае розныя формы, памеры і дызайн. Падыходзіць пад сукенку, шорты, штаны і мноства іншых вобразаў. Паколькі рукі ў сучасных людзей занятыя тэлефонамі і планшэтамі, большасць аддаюць перавагу рукзакам...»

Як вы думаеце, прадстаўнікі якой прафесіі займаюцца сёння афармленнем вітрын? А ці ведаеце вы, якімі навыкамі павінны валодаць, напрыклад, спецыялісты рэстараннага сэрвісу? Ці чаму фларыстыка — не жаночая справа? Рэспубліканскі конкурс WorldSkills Belarus 2018 даў адказы на многія пытанні і стаў сапраўдным гідам у свет сучасных прафесій. За два дні Футбольны манеж і Falcon Club, дзе размясціліся конкурсныя пляцоўкі па 37 кампетэнцыях, наведала некалькі тысяч школьнікаў.

У кампетэнцыі «Кандытарскае мастацтва» ўдзельнікі спаборніцтваў стварылі сапраўдныя салодкія шэдэўры.

ЗАГЛЯДЗЕЦЦА НА ВІТРЫНУ

— Мерчандайзінг вітрын — вельмі цікавая сфера, якая знаходзіцца на стыку мастацтва, дызайну, псіхалогіі, псіхафізікі, эканомікі, маркетынгу і рэкламы, — тлумачыць **галоўны эксперт у кампетэнцыі «Візуальны мерчандайзінг», дырэктар ТАА «Цэнтр паспяховых продажаў» Алена ІВАНОВА.** — Задача візуальнага мерчандайзера — прыпаднесці пакупніку тавар у выгадным святле. Вітрына ў гандлёвым аб'екце — перш за ўсё інструмент маркетынгу: пры дапамозе дызайнерскіх рашэнняў забяспечвае доўгатэрміновую камунікацыю са спажыўцом.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Свой выбар

НА ВЫШЫНІ І ПАД НАПРУЖАННЕМ

Сяргей ЛЯХ — адзін з тых, хто дапамагае праводзіць электрычнасць у нашы дамы. У літаральным сэнсе. Калі пасля навальніцы альбо моцнага ветру яна знікае, брыгада электраманцёраў выязджае на ліквідацыю непаладак нават пасярод ночы.

Да выбару сваёй прафесійнай будучыні дзевяцікласнік паставіўся сур'ёзна і, можна сказаць, з разлікам. Падбіраў профільныя сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ў Мінску так, каб можна было вучыцца там адначасова са старэйшай сястрой, якая тады паступала ў медыцынскі ўніверсітэт. Сяргея зацікавіла энергетыка, ён быў упэўнены: з такой спецыяльнасцю можна дзе заўгодна ўладкавацца. Так жа асэнсавана хлопец потым шукаў першае працоўнае месца. У выніку трапіў, куды хацеў, — вярнуўся на радзіму, у Лепельскія раённыя электрасеткі. На пытанне, чаму не захацеў застацца ў сталіцы, Сяргей адказвае:

— Вялікі горад мяне не ўразіў. Так, я з задавальненнем прыязджаю да аднагрупнікаў альбо на адпачынак, але жыць там не хацеў бы, не люблю мітусні. Мне нават у кватэры няўтульна, таму будую прыватны дом у прыгараднай вёсцы з умовамі, лічы, гарадскімі. Яшчэ наведваю бацькоў, дапамагаю ім з агародам і гаспадаркай. Да працы з зямлёй прывучаны з маленства, магу трактарчык адрамантаваць, зямлю ўзараць, дровы прывезці і пакалоць — і сабе, і суседзям, — без праблем.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)